МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ БУДУЩИХ СПЕЦИАЛИСТОВ

**Межвузовский сборник научных статей с международным участием**

**Выпуск 4**

**В двух частях**

**Часть 1**
***ПСИХОЛОГИЯ***

***Под научной редакцией доктора психологических наук, профессора Я. Л. Коломинского***

**Часть 2**
***ПЕДАГОГИКА***

***Под научной редакцией кандидата педагогических наук, доцента В. И. Козел***

Рекомендовано к печати
редакционно-издательским советом университета

Барановичи
РИО БарГУ
2015

Репозиторий БарГУ

УДК 821.161.3-3

***Т. М. Пучынская***
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ГІСТАРЫЗМ ЯК АСНОЎНЫ ПРЫНЦЫП І МЕТАД ВЫВУЧЭННЯ СТУДЭНТАМІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца праблема выкладання сучаснай беларускай прозы з пазіцый гістарызму як вядучага прынцыпу і метаду вывучэння мстацкіх твораў. Даказваецца, што гістарызм з'яўляецца не толькі важнейшай метадалагічнай асновай выкладання нацыянальнай літаратуры ва ўстановах вышэйшай адукацыі, але і надзейным арыенцірам у асэнсаванні студэнтамі мастацкай значнасці твораў сучаснасці, у тым ліку і кніжных навінак.

**Ключавы словы:** гістарызм, прынцып, прыём, сучасная беларуская проза, студэнты-філолагі.

## Уводзіны

Праблема вывучэння студэнтамі-філолагамі твораў сучаснай (асабліва пачатку XXI стагоддзя) беларускай прозы актуальная, паколькі існуюць пэўныя цяжкасці ў выкладанні сучаснага літаратурнага працэсу. Па-першае, вучэбныя праграмы па гісторыі беларускай літаратуры ва ўмовах дэфіцыту вучэбнага часу



Репозиторий БарГУ

прапануюць вывучаць сучасную літаратуру пераважна аглядна; манаграфічным шляхам прэзентуецца творчасць невялікай колькасці сучасных пісьменнікаў. Таму ў адпаведнасці з новымі вучэбнымі планамі па асобных спецыяльнасцях уведзена дысцыпліна «Сучасны літаратурны працэс». Па-другое, у літаратурным працэсе пачатку XXI стагоддзя з'яўляюцца ўсё новыя імёны аўтараў, скарбонка нацыянальнай літаратуры папаўняецца творамі прызнаных майстроў слова, а таксама маладых аўтараў, мала вядомых студэнтам-чытачам. Па-трэцяе, часам складана ацаніць літаратурную навінку, якая не паспела прайсці «выпрабаванне» часам і якая не заўсёды грунтоўна, у выглядзе асобных даследаванняў, артыкулаў, манаграфій, прааналізавана літаратурнымі крытыкамі. Азначаныя цяжкасці абумоўліваюць метадычную праблему адсутнасці цэласнага і глыбокага ўяўлення студэнтаў аб літаратуры сучаснасці, яе ідэйна-мастацкім і тэматычным змесце.

**Асноўная частка**

Кожная ўстанова вышэйшай адукацыі імкнецца распрацаваць уласную мадэль падрыхтоўкі спецыяліста, на фарміраванне якой накіраваны адукацыйны і выхаваўчы працэс. Сярод разнастайных падыходаў да фарміравання асобы спецыяліста, яго псіхолага-педагагічнай культуры распрацоўваецца мадэль, арыентаваная на прафесіяграму [1, с. 331], якая апісана ў адукацыйных стандартах вышэйшай прафесійнай адукацыі і ўключае патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў спецыялістаў.

У адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі прынцыпова важнае значэнне для фарміравання прафесійных якасцей будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, падрыхтоўка якіх вядзецца ў БарДУ, мае адзінства гісторыка-генетычнага і гісторыка-функцыянальнага «прачытання» твораў беларускай літаратуры. Прынцып гістарызму актуальны на ўсіх этапах вывучэння студэнтамі гісторыі беларускай літаратуры, аднак істотныя цяжкасці ўзнікаюць менавіта ў працэсе вывучэння сучаснай літаратуры, найменш аддаленнай у часе і таму складанай для яе асэнсавання студэнтамі.

Мэта дадзенага артыкула — вызначыць змест гістарызму як прынцыпу і метаду вывучэння сучаснай беларускай літаратуры на этапе знаёмства студэнтаў з творчасцю празаікаў.

Задачы:

1) высветліць сутнасць гісторыка-генетычнага і гісторыка-функцыянальнага падыходаў да вывучэння сучаснай беларускай літаратуры на прыкладзе прозы;

2) распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні прыёмаў аналізу празаічных твораў з пазіцый канкрэтна-гістарычнага падыходу на занятках па вывучэнні студэнтамі-філолагамі сучаснай літаратуры.

Метадалагічная праблема гістарызму ў разуменні сутнасці мастацкай літаратуры трывала ўвайшла ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры (Дз. І. Ліхачоў, Г. М. Паспелаў, В. У. Івашын і інш.), у методыку выкладання (М. А. Лазарук, В. У. Івашын, А. І. Бельскі), а таксама ў практыку выкладання літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе. Працы пералічаных даследчыкаў маюць несумненную каштоўнасць і выкарыстоўваюцца ў практыцы выкладання літаратуры. Аднак ёсць неабходнасць у дадатковым метадычным асэнсаванні праблемы гістарызму ў вывучэнні студэнтамі сучаснай літаратуры на прыкладзе знаёмства з прозай.

Метады даследавання — тэарэтычныя (аналіз педагагічнай, літаратуразнаўчай, метадычнай літаратуры), эмпірычныя (назіранне).

Гістарызм разумеецца даследчыкамі ў розных значэннях: у шырокім сэнсе (як метадалагічная аснова, прынцып выкладання, як падыход да выкладання літаратуры), у вузкім (як адзін са шматлікіх прыёмаў аналізу мастацкага твора, «запазычаных» з літаратуразнаўства).

Як адзначае Л. Якушына, паўнавартасную літаратурную адукацыю неабходна ўгрунтоўваць на выкарыстанні розных аспектаў літаратуразнаўчай навукі: ідэйна-эстэтычнага, гісторыка-генетычнага (сацыяльнага), тыпалагічнага і гісторыка-функцыянальнага [2, с. 12].

«Гістарызм — гэта не толькі вытлумачэнне сувязі літаратуры з ...эпохай; на гістарызме грунтуецца літаратурная перыядызацыя, асвятленне этапаў літаратурнага развіцця, літаратурных напрамкаў, метадаў, стыляў, жанраў, гісторыка-літаратурных праблем, раскрыццё індывідуальнасці пісьменніка» [2, с. 96]. Гісторыка-літаратурны падыход успрымаецца ў літаратуразнаўчай і метадычнай навуцы як надзейны крытэрый глыбокага асэнсавання эпічнага твора.

В. У. Івашын у артыкуле «Генетычна-гістарычнае і функцыянальна-гістарычнае “прачытанне” класікі» [3, с. 93—109], разглядае



Рэпазіторый БарДУ

гістарызм як важнейшую метадалагічную аснову выкладання літаратуры ў сярэдняй школе. Гістарычны падыход вызначае таксама методыку працы выкладчыка і ва ўстановах вышэйшай адукацыі, ён пакладзены ў аснову выкладання беларускай літаратуры ў працэсе падрыхтоўкі настаўнікаў мовы і літаратуры.

Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што любы літаратурны твор, асабліва празаічны, больш звязаны з аналітычнай, чым з пачуццёвай дзейнасцю, выяўляе рысы часу на ўзроўні зместу. Аналіз эпічнага твора як адлюстравання пэўнай эпохі і веданне часу, калі быў напісаны твор, з'яўляюцца неабходнымі таму, што гэта дазваляе студэнтам глыбей вывучыць аглядныя і манаграфічныя тэмы, вызначыць пераемнасць у развіцці літаратурнага працэсу.

Практыка выкладання гісторыі беларускай літаратуры пацвярджае, што гісторыка-генетычны (сацыяльны) прынцып з'яўляецца вядучым пры вывучэнні аглядных тэм. Знаёмячы студэнтаў з агульнымі тэндэнцыямі развіцця літаратуры на сучасным этапе (з сярэдзіны 80-х гадоў і да пачатку XXI стагоддзя), выкладчык звяртае ўвагу і на пазітыўныя, і на крызісныя моманты рэчаіснасці ў сучаснай гісторыі Беларусі. Рысы сённяшняга дазваляюць студэнтам вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў сучасным літаратурным працэсе, зразумець светапогляднае абнаўленне ў змесце празаічных твораў, ацаніць неардынарнасць мастацкіх твораў мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага напрамкаў.

На аглядных лекцыях па сучаснай літаратуры неабходна спыніцца на наступных момантах, звязаных з гісторыяй Беларусі:

1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь, прыняцце Закона аб мовах у БССР паспрыяла таму, што беларуская літаратура з пачатку 90-х гадоў пачала актыўна мадэрнізавацца, у беларускай прозе ўсталёўваецца крытычнае і адначасова праўдзівае, гуманістычнае ўспрыманне рэчаіснасці. Пачынаюць актыўна развівацца тэмы, якія ў савецкі перыяд знаходзіліся на «другім» плане: старонкі старажытнай гісторыі Беларусі, эпоха таталітарызму, хрысціянскае і біблейска-філасофскае ўспрыманне рэчаіснасці. Адкрываецца новая старонка ў гісторыі літаратуры — творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў.

2. Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі 1986 года кардынальна памяняла погляды і ўяўленні сучасных пісьменнікаў, прадвызначыла трагічны пафас твораў. Беларуская

Рэпазіторый БарДУ

проза ў сваім развіцці прайшла шлях ад прыродацэнтрызму, сцвярджэння ідэі гармоніі чалавека і навакольнага свету, да ўсведамлення экалагічных праблем, трывогі за парушаную раўнавагу паміж чалавекам і прыродай. Выкладчык звяртае ўвагу на тое, што на сучасным этапе развіцця літаратуры экалагічная тэматыка цесна звязана з Чарнобылем, які асэнсоўваецца пісьменнікамі (В. Казько, І. Шамякін, І. Пташнікаў, В. Гігевіч, С. Алексіевіч, Н. Рыбік, Л. Левановіч, А. Федарэнка і інш.) не столькі як экалагічная, колькі як маральная праблема («духоўны» Чарнобыль). Паводле слоў А. І. Бельскага, Чарнобыль стаў «канцэптам мыслення сучасных пісьменнікаў».

3. Неабходна акцэнтаваць увагу студэнтаў на тым, што пашырэнне працэсу урбанізацыі ў развіцці сусветнай цывілізацыі прывяло да актыўнага мастацка-вобразнага асваення тэмы горада ў беларускай прозе. Дамінаванне вясковай тэматыкі змяняецца мастацкім «абжываннем» горада ў творах Г. Багданавай, Б. Пятровіча, Л. Рублеўскай, А. Глобуса, М. Шайбака, А. Асташонка і інш. Горад у мастацкай інтэрпрэтацыі сучасных пісьменнікаў паўстае і як эстэтычна-каштоўнасны цэнтр, багаты на разнастайныя канцэпцыі, асацыяцыі, уражанні, а таксама і як няўтульнае, неспрыяльнае для існавання чалавека асяроддзе.

4. У працэсе гутаркі са студэнтамі высвятляецца, што ў сучасным грамадстве часам назіраюцца дэструктыўныя сацыяльныя працэсы. Выкладчык наводзіць студэнтаў на думку аб тым, што пазіцыя сучаснага чалавека, часта расчараванага, разгубленага ў хаатычным, дынамічным свеце, найбольш актыўна выяўляецца ў беларускай прозе постмадэрнісцкага напрамку. Дадзены каментарый дапамагае падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання тых твораў сучасных пісьменнікаў, якія часам шакіруюць чытача сваёй «непрыхаванай» жыццёвай праўдай.

На аглядных лекцыях адзначаецца, што на сучасным этапе перад пісьменнікамі нанава паўстае задача выпрацоўкі пазітыўнай праграмы, поглядаў на аснове глыбейшага засваення традыцый, маралі і светапогляду беларусаў. Сучасныя пісьменнікі працягваюць традыцыі класікаў беларускай літаратуры. Па-ранейшаму актыўна развіваецца вясковая тэматыка, з'яўляюцца творы і на тэму вайны.

Репозиторий БарГУ

Такім чынам, увага да гістарычнай эпохі, у якую быў напісаны літаратурны твор, дае магчымасць студэнтам выявіць не толькі агульныя заканамернасці мастацкіх напрамкаў і стыляў, але і зразумець тыя змяненні, якія адбываюцца ў сувязі з агульным развіццём літаратуры і індывідуальнай манеры пісьменніка (напрыклад, рэалізм прозы В. Казько з выкарыстаннем мастацкага прыёму «плынь свядомасці» і рэалізм твораў В. Быкава з выразнымі экзістэнцыйнымі матывамі), іншымі словамі, высветліць праблему традыцый і наватарства ў творчасці сучасных пісьменнікаў.

Найбольш складана рэалізаваць гісторыка-функцыянальнае «прачытанне» сучаснай беларускай прозы. Калі гісторыка-генетычны падыход прадугледжвае вывучэнне прозы ў залежнасці ад эпохі, у якую напісаны твор, то гісторыка-функцыянальны — у залежнасці ад эпохі, у якую твор чытаецца. Вядома, што кожны гістарычны адрэзак часу мае сваю арыгінальнасць, таму і фарміруюцца так званыя агульныя рэцэпцыйныя палі (Ю. Бораў) у межах пэўнай эпохі і культуры. Гэта азначае, што не толькі ад духоўнага і жыццёвага вопыту, індывідуальных асаблівасцей чытача залежыць успрыманне мастацкага твора, але і ад разумення таго, што розныя гістарычныя эпохі нараджаюць адметнае прачытанне адных і тых жа літаратурных твораў. Гаворка ідзе як пра змест твораў, так і пра іх мастацкую форму. Іншымі словамі, перад студэнтамі паўстае даволі складаная задача — высветліць мастацкую вартасць сучасных твораў, іх актуальнасць для сённяшняга чытача, ацаніць літаратуру як жывую, дзейсную мастацкую з'яву сучаснасці.

Кожнае новае пакаленне глядзіць на творы класікі з гістарычнай вышыні сучаснасці, ацэньвае іх з пазіцый свайго часу. А як быць з сучаснымі творамі, якія яшчэ «не прайшлі выпрабаванне» часам, «не паспелі даказаць» чытачам сваю праўдзівасць, глыбіню пазнання жыцця? Безумоўна, многае ў дадзенай сітуацыі залежыць ад выкладчыка, які павінен дапамагчы студэнтам зарыентавацца ў кніжных навінках, шматлікіх імёнах, постацях пісьменнікаў, мастацкіх творах.

Рыхтуючы вучэбна-метадычныя матэрыялы для забеспячэння вучэбнага працэсу, выкладчык павінен прадумаць, якія творы сучаснай прозы павінны ўвайсці ў вучэбную праграму для азнаямлення на лекцыйных, семінарскіх, практычных занятках,



Репозиторий БарГУ

а якія прапанаваць студэнтам для вывучэння ў межах кіруемай самастойнай работы, напісання курсавых, дыпломных работ, навуковых артыкулаў на канферэнцыі. Галоўнае, каб студэнты, будучыя настаўнікі беларускай літаратуры, набылі навык самастойнай ацэнкі кніжных навінак, маглі адрозніць сапраўды значную эстэтычную з'яву ад спрошчанай ці нязначнай.

Звяртаючыся да рэалій сённяшняга дня, выкладчык рэалізуе гістарызм адначасова і як прынцып (гісторыка-генетычны і гісторыка-функцыянальны), і як прыём выкладання. Значэнне паняцця «прыём» і «метад» у межах дадзенага даследавання мы ўжываем як сінанімічныя і тоесныя. Па словах украінскага літаратуразнаўцы В. П. Марко, «прыёмы, як і спосабы аналізу твора, у большай ступені адносяцца да методыкі выкладання літаратуры і інтэрпрэтацыі тэксту… Гісторыка-літаратурны каментарый. Гэта тлумачэнне фактаў, з'яў, назваў, імёнаў, літаратурных рэмінісцэнцый, без ведання якіх разуменне тэксту было б няпоўным» [4, с. 45]. Мы згодны з меркаваннем В. П. Марко, які сярод шматстайных прыёмаў аналізу мастацкага твора ў якасці прыярытэтных называе і гісторыка-літаратурны каментарый.

Сярод прыёмаў, якія на вучэбных занятках дазваляюць інтэрпрэтаваць творы сучаснай прозы ў кантэксце сённяшняга дня, акрамя гісторыка-літаратурнага каментарыя, традыцыйнай праблемнай гутаркі, дыскусіі, падрыхтоўкі студэнтамі прэзентацый па творчасці пісьменніка, маналагічных выступленняў (паведамленне пра асобу пісьменніка, даклад або рэферат), неабходна асобна вылучыць водгук. Актуальнасць напісання студэнтамі водгуку як віду творчай работы абумоўлена тым, што дадзены від працы спрыяе фарміраванню высокай чытацкай культуры студэнтаў, выхаванню іх эстэтычнага густу. Студэнтам прапануецца напісаць водгук на мала знаёмы ці незнаёмы твор сучаснага аўтара. Практыкуючы напісанне студэнтамі водгукаў як на вучэбных занятках, так і ў межах кіруемай самастойнай работы, выкладчык мае магчымасць не толькі развіваць чытацкія ўменні студэнтаў, кантраляваць глыбіню асабістага асэнсавання імі мастацкіх вобразаў, ступень набліжанасці думкі чытача да канцэпцыі аўтара, але і рыхтаваць студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці. Водгук з'яўляецца «праграмным» відам пісьмовай работы ў сярэдняй школе, таму ўменне яго напісаць дапаможа студэнтам у будучым фарміраваць уменні школьнікаў па



Рэпазіторый БарДУ

выкананню дадзенай творчай працы. Напісанне студэнтамі водгуку дапамагае творча асэнсаваць прачытаны твор у межах сучаснай літаратуры, спалучыць яго эмацыянальную ацэнку з лагічным каментарыем да мастацкага слова, у пісьмовай форме паслядоўна і граматна выкласці ўласныя думкі; развіваць у студэнтаў вобразнае мысленне. Выкладчык можа практыкаваць іншыя віды творчых прац, напрыклад напісанне эсэ, галоўнае, каб мэты, задачы заняткаў былі выкананы.

Уменне студэнтаў аналізаваць творы сучаснай прозы з пазіцый гісторыка-функцыянальнага падыходу фарміруецца не толькі на вучэбных занятках, але і ў працэсе самастойнай даследчай працы, пазааўдыторнай дзейнасці. Складана ўявіць дасведчанага чытача сучаснай літаратуры, які не наведвае, напрыклад, чытальную залу новых паступленняў, якая працуе ва універсітэце і дазваляе студэнтам пазнаёміцца як з кніжнымі навінкамі, так і з перыядычнымі літаратурна-мастацкімі выданнямі. Студэнты-філолагі не толькі самастойна працуюць у зале новых паступленняў, але і наведваюць арганізаваныя тут вучэбныя заняткі ў межах сумеснага праекта кафедры філалогіі і бібліятэкі.

Асабіста ўсвядоміць тэндэнцыі ў развіцці сучаснай беларускай прозы, атрымаць яркія, запамінальныя ўражанні дапамагаюць студэнтам сустрэчы з пісьменнікамі і прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі. На працягу апошніх гадоў Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт наведалі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Цікавымі былі сустрэчы з пісьменнікамі Р. Баравіковай, Л. Дранько-Майсюком, Э. Акуліным, Б. Пятровічам, Л. Рублеўскай, Ю. Татарынавым, М. Міцкевічам, сынам Я. Коласа; пісьменніцай Баранавіцкага краю Р. Раманчук. Як паказвае практыка, пасля такіх сустрэч студэнты не толькі глыбей засвойваюць творчасць пісьменнікаў, з якімі адбылася сустрэча, але і набываюць навык самастойнай ацэнкі сучасных літаратурных з'яў, паступова вызваляючыся ад першапачатковай эмацыянальнай ацэнкі «падабаецца-не падабаецца» і ўзнімаючыся да ўсвядомленага і крытычнага ўспрымання кніжных навінак.

Глыбей зразумець сучасны літаратурны працэс, усвядоміць літаратурны твор не як помнік пэўнай гістарычнай эпохі (у тым ліку і сучаснай, якая неўзабаве стане гісторыяй), а як жывую, дзейсную мастацкую з'яву сучаснасці дапамагае літаратурна-мастацкая творчасць студэнтаў. Штогод ва ўніверсітэце кафедрай

Репозиторий БарГУ

філалогіі праводзіцца літаратурная гасцёўня «І не знікаць паэтам вечна..», дзе студэнты факультэта славянскіх і германскіх моў, факультэта педагогікі і псіхалогіі дэманструюць вынікі ўласнай літаратурнай творчасці.

## Заключэнне

Канкрэтна-гістарычны падыход спрыяе фарміраванню цэласнага ўяўлення студэнтаў-філолагаў пра сучасны літаратурны працэс, удасканальванню і развіццю навыкаў аналітычнай інтэрпрэтацыі кніжных навінак, работы з перыядычнымі выданнямі, літаратурнай крытыкай апошніх год. Веданне гісторыі, характару эпохі, асаблівасцей часу, у тым ліку і сённяшняга, з'яўляецца абавязковай умовай атрымання студэнтамі, будучымі настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, грунтоўнай літаратурнай адукацыі.

Дадзены артыкул не вычэрпвае заяўленай праблематыкі, а толькі прадвызначае вектары далейшага даследавання.

## Спіс цытаваных крыніц


1. Педагогика : учеб. пособие для бакалавров / под ред. П. И. Пидкасистого. — 3-е изд., испр. и доп. — М. : Юрайт, 2012. — 511 с.
2. *Якушина, Л. С.* Соотношение литератураведческого и школьного анализа / Л. С. Якушина // Соврем. вопр. анализа литератур. произведения в шк. : межвуз. сб. науч. тр. МГПИ. — М. : [б. и.], 1986. — С. 5—12.
3. *Івашын, В.* З пазіцый гуманізму. Тэарэтыка-метадалагічныя і метадычныя праблемы літаратурнай адукацыі / В. Івашын. — Минск : НІА, 1998. — С. 93—109.
4. *Марко, В. П.* Аналіз художнього твору : навч. посіб. / В. П. Марко. — К. : Академвидав, 2013. — 280 с. — (Серія «Альма-матер»).


Материал поступил в редколлегию 25.01.2014 г.

Репозиторий БарГУ